Пенсионеры получат прибавку стр.3
О судьбе Быкова заботится Москва стр.5
Ящик пива достался врачам стр.7



Газета Слонімская

Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.



№ 6 (139). 3 — 9 лютага 2000г. Незалежны грамадска-палітычны штотыднёвік Кошт 60 руб.

КУПЛЯЦЬ ЦІ НЕ КУПЛЯЦЬ?


Фота IREX/ProMedia

У Слоніме, як і па ўсёй Беларусі, павысіліся цэны на масавыя гатункі хлебабулачных вырабаў. На хлеб цэны ўзраслі на 50%, а на булачныя вырабы — на 30%. Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведаміла начальнік планавага аддзела слонімскага хлебазавода Людміла Губарэвіч.

Сяргей ЧЫГРЫН

навіны

Чарговае падаражанне

На мінулым тыдні падаражэў праезд у прыгарадных і міжгародніх аўтобусах.

Праезд у міжгародніх аўтобусах цяпер будзе каштаваць на 48% даражэй, чым было да 28 студзеня (тарыф на праезд у мяккіх аўтобусах — 5,7 рублёў за 1 км), а ў прыгарадных — на 50%. А вось, каб падняць кошт праезду ў гарадскіх аўтобусах у Слоніме — патрэбны дазвол абласнога начальства.

Сяргей ЁРШ

Дырэктар патрабуе грошы

Генеральны дырэктар ААТ "Мастоўдрэў" Віктар Буры запатрабаваў ад інжынерна-тэхнічных работнікаў цэха драўніна-стружкавай пліты, каб яны добраахвотна аддалі прадпрыемству свой месячны заробак у якасці кампенсацыі выдаткаў на рамонт станка, які сапсаваўся два месяцы назад у выніку пажару.

Сума выдаткаў склала 932 млн. недэнамінаваных рублёў. Канкрэтны вінаўнік не выяўлены, таму кіраўніцтва ААТ палічыла, што матэрыяльную адказнасць павінны несці ўсе спецыялісты цэха. Паколькі добраахвотнікаў пісаць заявы не знайшлося, на наступны дзень дырэктар адмяніў сваё рашэнне, але не адмовіўся ад думкі спагнаць выдаткі са спецыялістаў.

Ні кала, ні двара

Старшыня Мастоўскага райвыканкама Аляксандр Кісялёў свой прыватызаваны дом у вёсцы Харціца (калгас "Дружба") перапісаў на сына.

Аднак начальніку таксама трэба дзесьці жыць. Хутка будзе пабудаваны асабняк у Мастах па вуліцы Каштанавай, у які, магчыма, пераедзе старшыня райвыканкама.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Больш некандыцыі

Па інфармацыі начальніка Мастоўскай насеннай інспекцыі Сядач, з 84% праверанага ў калгасах раёна насення яравых, толькі 49% адпавядае кандыцыі.

На сённяшні дзень толькі пяць калгасаў і саўгасаў раёна маюць добрае насенне.

Антон МАКЕЙ

праблема

АБЫДЗЕМСЯ БЕЗ АЎТОБУСАЎ?

У апошнія дні ў Слоніме зноў узнікла праблема з рухам гарадскога грамадскага транспарту.

Напрыклад, 29, 30 і 31 студзеня аўтобусы працавалі з перабоямі, а на некаторых маршрутах іх часам не было зусім. ,У нядзелю многія жыхары Альбярціна адмовіліся ад задумы наведаць гарадскі рынак, бо доўгі час не было аўтобусаў, а пешшу ісці далёка...

Праца слонімскага грамадскага транспарту застаецца праблемай ужо на працягу некалькіх апошніх гадоў. Неаднаразова гэтае пытанне спрабаваў вырашыць гарвыканкам. Вось і ў панядзелак, 31 студзеня, дырэктара аўтапарка № 3 Уладзіміра Нікалаева выклікалі да гарадскога кіраўніцтва. Пра што там ішла размова і якім чынам будзе выпраўляцца сітуацыя, ён адмовіўся расказаць карэспандэнту "ГС". Не захацеў Нікалаеў пракаменціраваць і прычыны нявыхаду аўтобусаў на маршруты. Толькі сказаў, што "аўтобусы няспраўныя", а слонімцам, якія гадзінамі прастойваюць на прыпынках, параіў звяртацца па тлумачэнні асабіста да яго, Нікалаева Уладзіміра Мікалаевіча (службовы тэлефон 2-54-71).

Сяргей ЁРШ


Фота IREX/ProMedia

Слонімскія пасажыры штурмуюць аўтобус

У чужых чаравіках далёка не ўцячэш

Днямі ў слонімскую міліцыю паступіла паведамленне, што з гардэроба спартыўнай залы СШ № 3 зніклі хлапчуковыя чаравікі.

Праз пэўны час супрацоўнікі крымінальнага вышуку затрымалі злодзея — 22-гадовага непрацуючага слонімца. Міліцыяй быў затрыманы раней судзімы слонімец Р., які падазраецца ў тым, што ў сталоўцы на Першамайскай вуліцы адабраў ў непаўналетняга 1000 рублёў.

А 30 студзеня была ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да раней судзімай сланімчанкі С., якая ўкрала дзве шасцікілаграмовыя паляндвіцы і дзве торбачкі з гарбузовымі семкамі (гэта аж 100 шклянак насення).

Валянцін ЧУРЫЛА

Предприниматели снова бастуют

Всебелорусская забастовка частных предпринимателей состоится даже в случае экстренного принятия декрета главы государства об освобождении от уплаты НДС тех из них, чей месячный оборот не превышает трех тысяч минимальных заработных плат.

На сегодняшний день это составляет 6,6 миллиона новых рублей, или 7.500 долларов США в пересчете по рыночному наличному курсу.

Забастовка предпринимателей продлиться до 1 марта. Предполагается, что в акции примет участие от 60 до 70 тысяч предпринимателей, торгующих на вещевых рынках 30 городов. Всего в стране, по данным Министерства предпринимательства и инвестиций, насчитывается около 130 тысяч предпринимателей без образования юридического лица.

БелаПАН

финансы

ДЕНОМИНАЦИЯ НЕ СПАСЕТ ОТ ФИНАНСОВОГО КРИЗИСА

Константин СКУРАТОВИЧ

Это еще не гиперинфляция

С научной точки зрения, то, что происходит сейчас в Беларуси, еще не гиперинфляция. Хотя и очень на нее похоже. Так, по официальным данным, в июне 1999 года по отношению к декабрю 1990-го потребительские цены выросли в 727 тысяч раз, но при гиперинфляции такой скорости обесценивания деньги достигают за год. В Германии во времена гиперинфляции после первой мировой войны зарабатывали в месяц 200 миллиардов марок. Деньги получали два раза в день, и каждый раз делали на полчаса перерыв, чтобы сбегать в магазин и успеть купить хоть что-нибудь до очередного объявления курса доллара, так как после этого деньги вновь наполовину обесценивались.

Так на гиперинфляцию реагируют цены и люди. А деньги от нее "портятся". Например, длительное время динар, денежная единица Югославии, свободно конвертировался, то есть обменивался на любую твердую валюту. Но распад СФРЮ в 1992 году, политическая нестабильность, гражданская война, экономическая блокада поставили экономику на грань краха, жизненный уровень начал резко снижаться. Динар к тому времени перестал выполнять функции накопления и меры стоимости, перестал быть и средством обращения. В стране воцарился натуральный обмен. Национальная валюта использовалась исключительно для уплаты налогов, которые обесценивались буквально в течение дня.

В самом тяжелом положении оказались граждане, получавшие фиксированные доходы. Среднемесячная зарплата выражалась в триллионах динаров, что реально не превышало 15 долларов. Официальная безработица была зафиксирована на уровне 750 тыс. человек, хотя скрытая составляла около 1 миллиона.

(Продолжение на стр. 3)

ЯК ДАВЕСЦІ ПАЧАТУЮ СПРАВУ ДА КАНЦА?

29 студзеня ў Слоніме прайшоў адукацыйны семінар "Мясцовае самакіраванне на Беларусі: мінулае і сучаснае, досвед іншых краінаў, перспектывы рэфармавання". Ён быў арганізаваны Гродзенскім абласным аддзяленнем фонда імя Льва Сапегі і Беластоцкім цэнтрам грамадскай адукацыі "Польшча — Беларусь".


Фота Віталя ГІЛЯ

Як і чакалася, у цэнтры ўвагі на семінары быў... Леў Сапега. Гісторык і журналіст з Гродна Дзмітрый Кісель згадаў, што Статут Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) 1588 года Льва Сапегі быў ці не першай Канстытуцыяй у свеце, у якой былі замацаваны і асноўныя прынцыпы самакіравання. Кісель успомніў і пра генеральныя сеймікі ВКЛ, якія праходзілі ў XVI-XVII ст. у Слоніме і на якія збіралася эліта краіны — беларуская шляхта. Гэта толькі пацвярджае значнасць нашага горада ў тыя часы.

Акрамя гісторыі самакіравання на Беларусі, яго сучаснага стану і замежнага досведу, на семінары абмяркоўвалася і праблема ўсталявання ў Слоніме помніка Льву Сапегу.

Спачатку сітуацыю з помнікам акрэсліў былы дэпутат гарсавета Міхась Варанец. Па яго словах, існуе пяць стаўленняў да гэтай праблемы: скульптара Івана Міско, фонда Сапегі ў асобе Мірслава Кобасы, слонімскага гарвыканкама, ініцыятыўнай групы слонімцаў і саміх жыхароў горада. Аказваецца, затрымка са стварэннем помніка ўзнікла ў выніку непаразумення паміж фондам Льва Сапегі і скульптарам. Спонсары хочуць ведаць, на што выдзяляюцца грошы, якія патрабуе Іван Міско. А ў эскізе помніка, выкананым Міско, нечакана побач з Сапегам з'явіўся... сабака, і кошт помніка павялічыўся ў два разы!

На семінары ўзнікла дыскусія, падчас якой гучалі розныя прапановы і думкі (напрыклад, была прапанова абвясціць конкурс на лепшы праект помніка). На жаль, не прысутнічалі на семінары прадстаўнікі ініцыятыўнай групы (як, дарэчы, не прыйшоў і галоўны архітэктар горада Уладзімір Казырновіч), таму даведацца пра іх пазіцыю не ўдалося. А, між іншым, сёння ад іх залежыць, ці будзе ўстаноўлены помнік Льву Сапегу ў Слоніме. Дазвол уладаў ужо ёсць. Застаецца толькі давесці пачатую справу да канца. І калі ініцыятыўная група гэта не зробіць, дык, як было відаць з выступленняў падчас дыскусіі (у прыватнасці, краязнаўца Сяргея Чыгрына), гэта могуць зрабіць іншыя людзі...

Сяргей ЁРШ

НОВОСТИ

В милиции будет еще одно подразделение

В органах внутренних дел Беларуси будут созданы подразделения дознания, которые начнут действовать летом нынешнего года.

Новый институт в системе МВД будет способствовать качественному первичному расследованию преступлений, в основном на низовых уровнях — в городских и районных отделах, по менее серьезным преступлениям. Его существование предусмотрено новыми кодексами.

Подобные подразделения создаются не только с целью снятия нагрузки со следствия как такового, но и для более точного и профессионального ведения предварительного следствия.

БелаПАН

ЗДАРЭННІ

Абрабавалі ксяндза

Ахвярай злодзея стаў ксёндз аднаго са слонімскіх касцёлаў.

Вечарам 28 студзеня праз незачыненае акно злодзей трапіў у жылое памяшканне пры касцёле Св. Андрэя і ўкраў 300 даляраў, 200 нямецкіх марак, 20 польскіх злотых, 200 тысяч беларускіх рублёў, а таксама рэчы касцельнага абыходу, якія належылі ксяндзу Анджэю Краўчыку.

За 2 дні абрабавалі 4 аўтамабілі

Як паведамілі карэспандэнту "ГС" у Слонімскім ГРАУС, апошнім часам пачасціліся выпадкі крадзяжу з прыватных аўтамабіляў.

Так, 21 студзеня ў 18 гадзін з "Фольксвагена", які стаяў насупраць магазіна №16 па Брэсцкай вуліцы, былі ўкрадзены дакументы.

У гэты ж вечар каля 19 гадзін сланімчанін С. не знайшоў у сваіх незачыненых "Жыгулях", што сталі каля дзіцячага садка №5 на вуліцы 17 верасня, дакументаў, прадуктаў і дамскай сумачкі.

22 студзеня жыхар Д. з вёскі Дзераўная Слонімскага раёна, выйшаўшы вечарам з гарадской лазні, што на Камсамольскай вуліцы, не знайшоў у салоне сваіх "Жыгулёў" тэхпашпарта на машыну.

А 23 студзеня ў міліцыю звярнуўся прыватны прадпрымальнік А. Ён паведаміў, што прыкладна ў 21 гадзіну невядомыя адчынілі яго мікрааўтобус і ўкралі фотаапаратуру і падатковыя дакументы.

Міліцыя вядзе пошук злачынцаў.

Аршанскія даляры

Чарговая грашовая фальшыўка выяўлена ў Слоніме.

Слонімец Б. прынёс у аддзяленне "Белпрамбудбанка" для праверкі на сапраўднасць 100-даляравую купюру. Яна аказалася фальшывай. Мужчына паведаміў супрацоўнікам міліцыі, што набыў банкноту ў Оршы.

Валянцін ЧУРЫЛА

Пацярпеў веласіпедыст

Жыхар пасёлка Бярозаўка на машыне "Жыгулі" ехаў па адной з дзятлаўскіх вуліц і збіў веласіпедыста, 72-гадовага Ш.

У выніку, веласіпедыст атрымаў сатрасенне мозга, у яго таксама моцна траўміравана грудная клетка.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ПОЛИТИКА

«ЧЕМ ХУЖЕ — ТЕМ ЛУЧШЕ»

Сейчас можно с полной уверенностью предсказать, что до проведения в конце марта текущего года выборов президента Российской Федерации ни один из политиков не станет полностью раскрывать свои карты и явно демонстрировать свои истинные намерения.

С целью демонстрации преемственности в развитии интеграционных процессов и сохранения своего высокого рейтинга В.Путин предпримет ряд шагов, которые на первый взгляд могут показаться неизменным курсом на дружбу с А.Лукашенко. Он будет вынужден заняться реализацией курса, принятого его предшественником, хотя и не будет форсировать серьезные политические шаги.

В.Путин не тот человек, который вслед за А.Лукашенко стремглав бросится по пути создания виртуального союзного государства.

По этой причине Россия будет просто не в состоянии вкладывать в поддержку белорусского режима такие большие средства, которые вкладывались до этого.

Во-вторых, левая оппозиция в борьбе с В.Путиным будет использовать в качестве козырной карты популярность А.Лукашенко у российского обывателя. Белорусский вождь будет подаваться как антипод российского лидера, как образец доброго царя, способного дать людям лучшую жизнь. Коммунисты потеряли большинство в Госдуме, не имеют практически никаких шансов на президентское кресло, а также очевидно теряют поддержку в регионах, где начались их беспрецедентные провалы на выборах губернаторов. В этих условиях для них ничего не остается, как действовать по принципу "Чем хуже - тем лучше". Для такого подхода А.Лукашенко в качестве союзника незаменим.

В-третьих, Россия уже не сможет вести столь самостоятельную политику, как это было при Б.Ельцине. Тревожным сигналом по этому поводу стала задержка достаточно серьезного денежного вливания Запада в Россию в конце 1999 года. Запад вычеркнул Россию из малочисленного списка сверхдержав. Теперь он будет делать все для того, чтобы регулировать уровень экономической самостоятельности восточного гиганта. А одним из политических поводов вмешательства в российские дела останется Беларусь с ее диктатором.

Многое будет зависеть от позиции самого А.Лукашенко. Наиболее вероятны два варианта его поведения.

А.Лукашенко уже осознает, что его непродуманные интеграторские политические инициативы могут завершиться вхождением Беларуси в Россию. Неважно, как это произойдет: шестью областями или одним субъектом. В этом случае сам белорусский лидер теряет не только свой статус. Он теряет контроль за транзитными товарными и финансовыми потоками, от которых так неплохо кормился все пять с лишним лет. Он перестает быть полноправным субъектом международного права. Поэтому от суверенитета Беларуси в полной мере зависит политическая судьба А.Лукашенко.

Отсюда не исключено, что в ближайшее время мы увидим Лукашенко в качестве главного национал-патриота Беларуси. Для сохранения собственного политического будущего он в качестве главного вектора своих интересов непременно определит Запад. В этом случае он пойдет не только на символические переговоры с оппозицией, но и на другие послабления с точки зрения демократизации белорусского общества. При таком развитии событий он может даже попытаться сыграть спектакль по назарбаевскому сценарию: назначить выборы президента Беларуси "досрочно" и, пользуясь пока еще немалой поддержкой своего электората, закрепиться в качестве лидера, чтобы в течение ближайших лет более спокойно и уверенно вести самостоятельный политический курс. Учитывая то обстоятельство, что для А.Лукашенко потеря власти означает не пожизненные почет и уважение, а скамью подсудимых за все то, что он натворил за время своего правления, он прекрасно понимает, что удержаться у руля сегодня сможет только благодаря поддержке России. Поэтому вполне возможен такой вариант, что он предложит себя в верные слуги нового российского руководителя с одним условием: не отдать его на растерзание. В этом случае ему придется продолжать выступать в роли московской марионетки, которую он и играл последнее время. В обмен на собственное благополучие он втихую будет сдавать экономический и военный суверенитет Беларуси, что означает сдачу и суверенитета политического.

При любом из перечисленных сценариев российское руководство сохранит настороженное отношение к белорусскому партнеру и, не обращая на него серьезного внимания, будет продолжать наращивать военную и экономическую экспансию в Беларуси. В случае же попытки А.Лукашенко заявить о своем несогласии с российским курсом не исключен вариант использования Россией замены капризного и амбиционного политика более лояльным и прагматичным...

Владимир НИСТЮК


Фота IREX/ProMedia

Руководство Беларуси и России интегрируется и просит народ потерпеть. А народ терпит и пьет, пьет и терпит... И чем больше пьет, тем больше терпит.

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны: рэдакцыі........... 2-14-39
.............(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39
E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 1 лютага 2000г.
Час падпісання 18:00.
Надрукавана ў Слонімскай узбуйненай друкарні, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
Наклад 8600 экз.
Заказ № 415

ПЕНСИОНЕРЫ ПОЛУЧАТ ПРИБАВКУ

Граждане, выходящие на пенсию в 2000 году, для получения пенсионных пособий должны будут представлять справки о своей зарплате не за пять, как это было ранее, а за шесть самых "прибыльных" лет. Соответствующее решение принято Советом министров Беларуси. Далее ежегодно эти цифры будут увеличиваться на один год, пока не создастся такое положение, что размеры пенсий будут определяться исходя из среднего заработка за весь период работы.

Для каждого работника будет открыт индивидуальный лицевой счет. Данные о зарплате и месте работы, о страховом стаже и уплате взносов будут храниться в компьютерной базе данных на едином счете застрахованного, независимо от того, меняет он место работы или жительства. Для этих целей, скорее всего, будут использоваться личные номера, присваиваемые гражданам при получении паспортов нового образца.

По мнению специалистов, введение такой полной отчетности будет гарантировать назначение гражданам пенсий с точностью до рубля, учитывая заработки не только по основному месту работы, но и на стороне. Кроме того, такой принцип более справедлив; при нем будут сведены до минимума возможности подлогов и фальсификаций в пенсионной сфере.

С 1 января 2000 года начнут действовать и ряд других существенных изменений о пенсионном обеспечении.

Например, минимальный размер пенсии по возрасту теперь устанавливается в размере 25% бюджета прожиточного минимума (18091 руб.) и составляет 4523 руб.

Минимальный размер пенсии военнослужащим срочной службы и членам их семей, назначаемых в соответствии с законом "О пенсионном обеспечении военнослужащих, лиц начальствующего и рядового состава органов внутренних дел", а также надбавки и повышения к ним исчисляются из минимального размера пенсии по возрасту.

Наименьший размер трудовой пенсии при минимальном стаже работы 20 лет у женщин и 25 у мужчин составит 10057 рублей. На 20,4% увеличился максимальный размер трудовых пенсий. Без надбавок и повышений при индивидуальном коэффициенте 1,3 с 1 января 2000 года она составляет 19784 рублей. А максимальная пенсия у неработающих пенсионеров (при наличии коэффициента 4,0) установлена в размере 27254 рублей. Значительно увеличился размер максимальной пенсии и у неработающих шахтеров. С 1 января 2000 года она достигла 34726 рублей.

Социальные пенсии повышаются в связи с увеличением бюджета прожиточного минимума в среднем на душу населения. Их перерасчет производится четыре раза в год: с 1 февраля, 1 мая, 1 августа и с 1 ноября.

С 1 января 2000 года в заработок для исчисления пенсий включаются все виды выплат (доходы, вознаграждения за выполненную работу), на которые, согласно законодательству, начислялись страховые взносы. Включение в заработок для исчисления пенсии авторских гонораров и вознаграждений за выполненные работы по договорам подряда и поручения также производится при условии уплаты из этих сумм страховых взносов на государственное социальное страхование. При этом суммы авторских гонораров за периоды творческой деятельности до 1 января 1991 года членам творческих союзов и других творческих работников, которые состояли членами профсоюзов работников культуры, включаются в заработок для исчисления пенсии независимо от того, что в эти периоды уплата страховых взносов не производилась.

Если будет установлено, что наниматель в нарушение действующего законодательства не начислял страховых взносов на государственное социальное страхование на ту или иную выплату, то данные выплаты все равно будут включены в заработок для начисления пенсии. В тоже время выплаты, на которые согласно действующему законодательству начисление страховых взносов не должно было производиться, не включаются в заработок работника для исчисления пенсии независимо от того, что наниматель начислял страховые взносы на эти виды выплат.

Лицам, которым пенсии будут назначаться в 2000 году (начиная с 1 января), их исчисление будет производиться из заработка за любые 6 лет подряд (по выбору обратившегося за пенсией) из последних 16 лет работы независимо от имеющихся перерывов, в 2001 году – за 7 лет подряд из последних 17 лет работы и т.д.

В тех случаях, когда обратившийся за назначением пенсии проработал менее 6 лет (7 лет и т.д.), заработок для исчисления пенсии будет определяться за фактически проработанные календарные месяцы.

При назначении пенсий работникам, занятым на сезонных работах, заработок в 2000 году определяется за 6 полных сезонов, в 2001 году – за 7 полных сезонов и т.д.

Сумма пенсии, причитавшейся пенсионеру и оставшейся неполученной в связи с его смертью, выплачивается в равных долях членам семьи, проживающим совместно с пенсионером на день его смерти, а также его нетрудоспособным иждивенцам, независимо от того, проживали ли они совместно с умершим или нет. Факт совместного проживания членов семьи с пенсионером на день его смерти, а также факт нахождения на иждивении нетрудоспособных членов семьи устанавливается Комиссией по назначению пенсий. Для лиц, проживающих в сельской местности, указанные факты могут подтверждаться справкой сельского Совета депутатов, либо решением суда.

Валентин ЧУРИЛО, юрист

ПАМЕРЫ ГРАШОВЫХ ДАПАМОГ НА ДЗЯЦЕЙ ПАВЯЛІЧАНЫ

З 1 студзеня 2000 года ўведзены новыя памеры аднаразовых і штомесячных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

У прыватнасці, аднаразовая дапамога маці, якая нарадзіла дзіця, будзе выплачана ў памеры сярэдняга мінімальнага спажывецкага бюджэту, які з 20 кастрычніка 1999 года складае 19990 рублёў. Летась такую дапамогу атрымалі 589 жанчын Слонімскага раёна. Аднаразовая грашовая дапамога маці, якая стала на ўлік у жаночай кансультацыі да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, будзе выплочвацца ў памеры 50% памеру дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці — 4997 рублёў. У мінулым годзе такую дапамогу атрымалі 465 жанчын.

Штомесячная дапамога працуючым маці, бацьку ці апекуну, якія знаходзяцца ў водпуску па догляду дзіцяці да трох гадоў (такіх дзяцей у Слонімскім раёне ў 1999 годзе налічвалася 1582), жанчынам, што вучацца з адрывам ад вытворчасці, жанчынам-ваеннаслужачым, а таксама жанчынам з ліку асоб радавога або кіруючага складу органаў унутраных спраў вызначана ў памеры 7000 дэнамінаваных рублёў.

Штомесячную дапамогу з надбаўкай 25% (8750 рублёў) будуць атрымліваць асобы з ліку адзінокіх маці, разведзеных жанчын і мужчын, калі адзін з бацькоў ухіляецца ад аплаты аліментаў, і ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

Дапамогу з надбаўкай 50% (10500 рублёў) будуць атрымліваць адзінокія маці з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без нагляду бацькоў, былыя выхаванцы дзіцячых дамоў (школ-інтэрнатаў), асобы, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да трох гадоў, а таксама жонкі ці іншыя асобы, якія даглядаюць дзяцей ваеннаслужачых тэрміновай службы.

4000 рублёў складае цяпер дапамога непрацуючым маці, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў (у тым ліку асобам, якія даглядаюць дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідаў першай групы ці састарэлых), а таксама жанчынам, якія ва ўстаноўленым парадку прызнаны беспрацоўнымі. Для асоб гэтай катэгорыі таксама прадугледжана дапамога з надбаўкай 25% — 5000 рублёў і 50% — 6000 рублёў.

Дапамога на дзіця ва ўзросце ад 3 да 16 гадоў (такіх дзяцей у Слонімскім раёне летась было 5004) дасягае 3000 рублёў, з 25% надбаўкай — 3750, а з 50% — 4500 рублёў.

Асобам, якія не працуюць, не атрымліваюць дапамогу па беспрацоўю і даглядаюць дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў, прадугледжана дапамога ў памеры 8000 рублёў; сем'ям, што выхоўваюць да 18 гадоў інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту або хворых на СНІД дзяцей — 6000 рублёў; дапамога адзінокай маці (жанчыне, якая нарадзіла дзіця не ў шлюбе), якая выхоўвае дзіця ва ўзросце да 1,5 гадоў — 3000 рублёў.

Трэба мець на ўвазе, што пры прызначэнні дапамог на дзяцей з 1 студзеня для вылічэння сукупнага даходу сям'і за 1999 год дзейнічае сярэдні мінімальны спажывецкі бюджэт, які складае 19990 рублёў. Згодна з заканадаўствам, дапамогі на дзяцей ад 3 да 16 гадоў прызначаюцца і выплочваюцца ў поўным аб'ёме ў выпадку, калі сярэдні сукупны даход на аднаго члена сям'і ў мінулым годзе не перавысіў 7996 рублёў, і ў памеры 50% ад устаноўленага, калі сукупны даход на члена сям'і летась не перавышаў 9995 дэнамінаваных рублёў.

Па ўсіх пытаннях, звязаных з налічэннем дзяржаўных дапамог на дзяцей, можна звярнуцца па тэлефонах 2-59-18 ці 2-54-77 у раённы аддзел фонда сацыяльнай абароны насельніцтва.

Марыя ПЯТЛІЦКАЯ, намеснік загадчыка Слонімскага раённага аддзела фонда сацыяльнай абароны насельніцтва

ДЕНОМИНАЦИЯ НЕ СПАСЕТ ОТ ФИНАНСОВОГО КРИЗИСА

(Начало на 1 стр.)

В начале века в России потребность финансирования военных расходов сначала вызвала инфляцию, а гражданская война разогрела ее до гиперсостояния. О тех временах говорят: деньги получали мешками, а коробка спичек стоила миллион. Понятно, цены росли быстрее зарплат, но они же опережали и рост денежной массы. Дело дошло до физической невозможности транспортировать дензнаки по стране.

Против крестьян, которые за хлеб хотели получить твердые деньги, чтобы покупать "мануфактуру", были направлены войска и спецотряды, которые этот хлеб буквально выбивали и выколачивали.

Впрочем, как всегда, простейшее решение оказалось и самым неэффективным...

Чтобы восстановить доверие населения к денежным обязательствам государства, решено было наряду с обычными дензнаками печатать червонцы - банковские билеты номиналом в 10 рублей (купюры в 1, 3, 5, 10 и 25 червонцев). Советский червонец как бы наследовал царский - золотую монету трехрублевого достоинства, поскольку имел золотое содержание в 7,74234 грамма чистого золота. Содержание было реальным, поэтому при необходимости червонцы можно было обменять на золото в учреждениях госбанка.

В условиях инфляции накопление невозможно

Без стабильных финансов не может быть устойчивого экономического роста, не может улучшаться жизнь населения, не могут эффективно работать системы социального обеспечения и страхования. Возьмем, например, пенсионный фонд, назначение которого заключается в том, что он накапливает средства работающих для того, чтобы выплачивать их им по выходе на пенсию. Но в условиях инфляции накопление невозможно, поскольку деньги обесцениваются быстрее, чем накапливаются. По этой же причине сейчас пенсии в Беларуси мало того, что невелики, они выплачиваются "с колес": как только предприятия перечисляют взносы, деньги тут же расходуются. Но финансовое состояние предприятий таково, что налоги и прочие платежи становятся для них неподъемными. Поэтому одно из двух: или финансовое оздоровление, или крест на пенсионной системе.

Инфляция и сбережения - вещи взаимоисключающие. Поэтому, как свидетельствует даже официальная статистика, за последний год жизненный уровень населения не увеличился, а если судить по собственному мироощущению, он стремительно падает. Поэтому, чтобы накопить сбережения для приобретения предметов длительного пользования, строительства и ремонта жилья, поездок в отпуск и вообще для дальних поездок, население вынуждено покупать валюту. Понятно, что сделать это можно лишь на "черном" рынке. А коль так, то рублевая цена доллара постоянно растет, и государству, которому тоже нужна валюта, необходимо наращивать производство рублей, и чем дальше, тем больше. И чем дальше, тем выше степень взаимного недоверия государства и населения. Если, к слову, вспомнить "червонец", то он был желанным как для пламенных революционеров, так и для заядлых врагов пролетарского государства.

В "зайца" не верят ни враги этого государства, ни его записные друзья. Да, пожалуй, и сама власть. Ведь недаром, по данным опросов, силовики принадлежат к категориям, наиболее часто покупающим СКВ. И в этом принципиальное отличие, уникальность, если хотите, нашей ситуации. Мы, конечно, бедные, но если что удается припрятать, так это доллары в чулке.

В банки деньги не несем, поскольку в среднем на семью в долларовом эквиваленте на банковские вклады попадает меньше одного "зеленого". То есть почти все, что мы имеем, - это наличность.

А в Германии, например, на банковских счетах бюргеров накоплено 2.000 млрд. марок, а в наличном обращении используется всего 253 миллиарда, то есть примерно 1/7 часть того, что хранится в банках. Таким образом, тот, у кого есть 100 тысяч, распоряжается 14 тысячами марок. А оставшимися деньгами банки торгуют, обеспечивая прибыль себе и проценты вкладчикам. Поэтому у самих банков, помимо резервов, денег нет.

Белорусскому государству тоже нужны настоящие деньги, которые можно было бы спокойно и стабильно менять на СКВ. Поэтому Нацбанк постоянно разрабатывает концепции, последняя из которых (Концепция валютной и денежно-кредитной политики на 1999 - 2000 гг.) предусматривает, что для стабилизации "зайца" требуется достаточно жесткая привязка курса белорусского рубля к одной из твердых валют или к корзине из нескольких твердых валют на основе соответствия рублевой денежной базы размерам золотовалютных резервов государства.

Так в свое время поступили многие, в том числе страны Балтии. Но для "привязки" нужны настоящие деньги - золото и валюта. Золота, понятно, нет. Валюты тоже нет, хотя и надо "всего" 400 - 500 млн. долларов. Правда, прибалты протянули Западу руку дружбы, хотя и ладонью вверх. Мы же показываем то кукиш, то кулак...

Газета Слонімская
3 — 9 лютага, 2000г. № 6 (139)

Причина женской депрессии

Американский психолог Эдуард Суарес опубликовал результаты своего исследования, согласно которому женщины с низким уровнем содержания холестерина в крови больше подвержены депрессии и чувству беспокойства.

Ученому удалось получить данные, согласно которым 39 процентов женщин с низким уровнем холестерина в крови имели в характере черты, которые говорили о том, что они подвержены депрессии, в то время как аналогичные признаки наблюдались только у 19 процентов женщин с нормальным уровнем холестерина. Кроме того, Суарес утверждает, что низкий уровень этого вещества в крови может привести к депрессии у недавно родившей женщины.

"У нас есть все доказательства того, что как у мужчин, так и у женщин низкий уровень холестерина может стать признаком, по которому можно предвидеть депрессию", – заявил профессор Суарес.

Однако из этого не следует, что женщинам следует начинать есть как можно больше сладостей и жирного. Профессор Суарес рекомендует повышать уровень холестерина в крови при помощи тщательно продуманной диеты, включающей в себя рыбу или рыбий жир.

Нормальным уровнем холестерина в крови считается от 180 до 200 миллиграммов на децилитр. Ниже 160 миллиграммов на децилитр — отклонение от нормы.

Бессоница — причина заболеваний

За последнее столетие средняя продолжительность сна у жителей нашей планеты сократилась на полтора часа, что сказалось на общем состоянии здоровья человечества, считают американские ученые.

Общеизвестно, что недосыпание отражается на деятельности мозга. Однако ученые из Чикагского университета пришли еще к одному неутешительному выводу: недостаточный сон может стать причиной биологических изменений, схожих с преждевременным старением и диабетом. Профессор Ева Ван Каутер, руководившая исследованием, считает, что человек чувствует себя лучше, когда спит не меньше восьми часов в сутки. В ходе ее эксперимента выяснилось, что даже у здоровых молодых людей, ежедневный сон которых ограничивали до четырех часов, нарушались обмен веществ и выделение гормонов.

В исследовании принимали участие одиннадцать молодых людей в возрасте от 18 до 27 лет. Вначале они спали три ночи подряд по восемь часов. Затем в течение шести последующих дней — по 4 часа в сутки, а в оставшиеся семь суток – по 12 часов. В ходе эксперимента выяснилось: при недосыпании организм подопытных на 40 процентов дольше регулировал уровень сахара в крови после потребления пищи с высоким содержанием углеводов. Кроме того, у невыспавшихся на 30 процентов снижалась способность выделять инсулин, что обычно происходит на ранней стадии диабета.

В 1910 году население развитых стран в среднем уделяло сну 9 часов в сутки. С тех пор эта цифра уменьшилась на полтора часа.

По материалам печати



Фота Віталя ГІЛЯ

Ольга ШОСТАК, ученица СШ№8, занимается в изостудии художника Евгения Иванова в Центре детско-юношеского творчества

Давайте любить наш город

Пишет вам танцующая и поющая бабушка. А что, вы таких не знаете? Вам, наверное, больше известны бабушки с тяжелыми сумками, снующие по магазинам в поисках дешевых продуктов. Одеты так, что 40-55-летним женщинам дашь полные 70. А ведь у них есть красивая одежда, да ее некуда одеть. А почему бы нашим бабушкам и дедушкам не организовать подобный клуб "после сорока". Вот в Альбертине, благодаря Алле Андреевне Салита, проходят вечера, где собираются бабушки и дедушки, жены с мужьями и одинокие мужчины и женщины. Они готовят концерты или просто вечера отдыха с танцами. Даже в некоторых деревнях есть клубы, куда могут придти люди бальзаковского возраста. А в городе куда пойти? Я предлагаю, чтобы в каждом микрорайоне города подыскали помещение или клуб для людей, которые хотят провести свой праздник или свободное время, потанцевать или послушать музыку. А также летом на танцплощадке можно один раз в месяц сделать вечер пожилых людей. Давайте думать об этом сейчас, а не потом.

Вечера отдыха для пожилых людей должны быть с буфетом без спиртного. А еще обязательно живые цветы в продаже. Для чего – догадайтесь сами. Это будет подарок для людей, которых уже списали со счетов. Люди после 40 – это немалая часть города. Давайте любить наш город.

Нина Степановна

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

ЛЁС НАС ЗВОДЗІЦЬ І РАЗВОДЗІЦЬ

Па шашы, што пралягала непадалёку ад хутара, раз-пораз прабягалі машыны, на нейкае імгненне разразаючы цемру вострымі лёзамі святла. Ад гэтага здавалася, што над дарогай лётаюць дзівосныя вогненныя матылі. Зінаіда сядзела ля акна ў вечаровым змроку. Святла знарок не запальвала, каб не прамінуць, калі на сваёй машыне да дому пад'едзе дачка. Жыве яна ў недалёкім горадзе і кожны вечар прыязджае да маці па малако ды смятану. У магазіне асабліва не накупляешся, ды і навошта тое магазіннае, пакуль ёсць свая кароўка.

На гэты раз Тамара спазнялася, і маці пачала ўжо хвалявацца. І таму, калі на дарожцы да хаты ўзніклі доўгачаканыя слупкі святла, выскачыла на двор.

Дачка была не адна. Прыехалі ўсёй сям'ёй: муж, яго бацька і трое дзяцей. Малыя, нягледзячы, што было цёмна, пабеглі ў сад шукаць яблыкі, якія ў гэту жнівеньскую пару былі надта смачныя і сакавітыя.

Гасцей Зінаіда не чакала, і таму цяпер усхвалявана думала, чым жа іх накарміць, не рыхтаваўшыся. Свае б дзеці нічога, але ж з імі прыехаў зяцеў бацька. Зінаіда бачыла яго ўпершыню. Ён жыў на Гомельшчыне. Кадравы ваенны. Калі пайшоў на пенсію ў чыне палкоўніка, прадаў сваю кватэру і некаторы час жыў у Мінску ў старэйшага сына. Усе грошы, што за яе выручыў, аддаў малодшаму, Мішу, і тыя з Зінінай дачкой купілі ў горадзе двухпакаёўку. Рады былі, бо да гэтага часу з дзецьмі перабіваліся то на прыватнай кватэры, то ў інтэрнаце. Жонка ў гэтага чалавека памерла даўно, але ён не жаніўся, баяўся, што мачаха не паладзіць з яго сынамі. А так ажаніцца мог бы, чаму ж не. Бо і цяпер меў прывабную знешнасць: невысокі, стройны, з густымі сівымі валасамі. Толькі голас нейкі ціхі, спакойны, зусім не камандзірскі.

Госці ад пачастунку дружна адмаўляліся, казалі, што нядаўна павячэралі дома, што прыехалі ўсёй сям'ёй не для гасцявання, а каб паказаць свату, дзе жыве сваццця, каб пазнаёміць іх. Але ж Зінаіда адпусціць без пачастунку не магла, і таму хуценька з дачкой сабралі на стол няхітрыя сялянскія прысмакі: нарэзалі сала, паляндвіцы, паставілі місачку са свежым тварагом і крамянымі маласольнымі гуркамі.

— Нічога смачнейшага за ўсё жыццё не еў, — хваліў яе пачастунак сват і ўсміхаўся мілай, нейкай сарамлівай усмешкай.

— Скажаце... — чырванела Зінаіда.

Калі госці засабіраліся дадому і Зінаіда з дачкой пайшлі ў камору, каб наліць малака і смятаны, Тамара, як у дзяцінстве, калі чаго-небудзь прасіла ў мамы, пацерлася шчакой аб яе плячо.

— Мамка, вазьмі яго да сябе.

— Каго? — не зразумела тая.

— Ну, Сяргея Міхайлавіча. Няхай ён у цябе жыве.

— Ты што, дачка, звар'яцела?! Як гэта — вазьмі? Што ён, кот які, ці птушка? Ды і што людзі скажуць? На старасці гадоў прымака сабе ўзяла. Ды і каго — свата!

— А што табе да тых людзей. Нам жа вельмі цесна: шэсць чалавек у двухпакаёвай кватэры. І ён не жыве, а мучыцца. Проста пахудзеў за гэтыя два тыдні, што ў нас. Вядома ж, у горадзе занятку ніякага. Цэлымі днямі ў чатырох сценах. Ён сталярнічаць любіць, дык дзе ж разгорнешся ў гарадской кватэры? А ў цябе раздолле. І ў хаце, і на падворку, і ў павеці. Там жа нават татаў варштат стаіць. Няхай бы майстраваў.

— Ох, дачка... Як у вас, маладых, усё проста. Ён жа мне чужы чалавек. Не то за кватаранта яго трымаць, не то за мужа? Людзі засмяюць.

— Што ты ўсё — людзі, людзі. Пра мяне падумай, пра маю сям'ю, а не пра нейкіх там людзей.

— А ў яго самога ты пытала? — як за выратавальную нітачку ўхапілася Зінаіда. — Можа сам не захоча.

— Папытаю, не захоча — няволіць не буду. Але мне здаецца, што яму тут спадабалася, — і Тамара хітра прыжмурыла адно вока.

— Бессаромніца! І не брыдка табе? — як у дзяцінстве, замахнулася на яе Зінаіда фартухом.

Госці паехалі, а яна так і не звяла вачэй да ранку. Усё думала над тым, што сказала Тамара. Яно ж, каб на добры толк, то няхай бы сабе і жыў. Чалавек прыгожы, талковы, што там гаварыць. Не п'яніца які. І па гаспадарцы дапамог бы. Сена назапасіць ці бульбу пасадзіць-выкапаць. Ён хоць і меў ваенны чын, але да сялянскай работы прызвычаены, бо вырас у вёсцы. А з другога боку як паглядзіш, то навошта ёй клопат на старасці гадоў? Жыве сабе адна, спакойна, калі захацела — зварыла, калі захацела — устала. Ніхто не ўказ. А тут ужо мусіш клапаціцца не толькі пра сябе, але і пра некага.

Думала-думала, ды так ні да чога і не дадумалася...

Тамара не паказвалася два дні: на працы запарылася, рэвізія была ў іхнім магазіне. А калі на трэці з'явілася, то Зінаіда сама першая пачала гутарку.

— Ну што, гаварыла з ім?

— Гаварыла. Ён згодзен.

— Згодзен... — перадражніла Зінаіда, невядома на каго зазлаваўшы. — І што ён казаў?

— Калі Зінаіда Мітрафанаўна мяне прыме, то я з радасцю.

— Ну, дык як ён прыедзе, з усімі пажыткамі, ці толькі з чамаданам адным?

— З пажыткамі, вядома, як жа інакш.

— А твой Міша што кажа? — пацікавілася Зінаіда.

— А нічога не кажа. Усміхаецца толькі. Яму гэта задумка таксама падабаецца.

— Падабаецца. Мала вас лупілі ў дзяцінстве, абоіх. Над бацькамі такія фокусы твараць, — уздыхнула Зінаіда, а потым дадала:

— Добра, вязі ўжо. Чаму быць, таго не мінаваць.

Так праз два тыдні ў Зінаідавай хаце з'явіўся гаспадар. І ў той жа дзень пайшоў з малатком па падворку: тое прыбіць, гэта падлатаць... А як у пачатку верасня пачалі капаць бульбу, то Зінаіда хадзіла паняю. Раней з самага ранку, ледзь управіўшы гаспадарку, бегла ў вёску з паўлітроўкай шукаць трактарыста, каб вытрас колькі баразён. А цяпер ёй і клопату пра гэта няма. Гаспадар дамовіўся з трактарыстам, наняў вясковых кабет, і за адзін дзень бульба была выкапана і схавана. І дзень той выдаўся цёплы, светлы. Упершыню за шмат гадоў Зінаіда адчула сябе па-сапраўднаму шчаслівай.

Аднойчы восенню, калі ліў дождж і не было асабліва чым заняцца, яна прапанавала:

— Можа я дастану з чамадана вашы рубашкі і павешу ў шафу? Месца ж хапае. Так будзе лепш, праўда, Сяргей Міхайлавіч?

— Калі ласка, калі вам не цяжка, — згадзіўся ён.

Зінаіда адчыніла чамадан і пачала даставаць яго рэчы. На самым дне знайшла нейкі пакуначак. Сяргей Міхайлавіч якраз на гэты час выйшаў нечага ў кладоўку, і яна, не здолеўшы перамагчы жаночую цікаўнасць, разматала анучку і ўбачыла ў ёй нейкія пісьмы. Глянула на канверты і ледзь не самлела: гэта былі яе пісьмы. У далёкім дзявоцтве яна пазнаёмілася на вакзале з маладым афіцэрам, які служыў у Карагандзе. Таго мімалётнага знаёмства было даволі, каб яны потым цэлы год перапісваліся. Потым яна выйшла замуж за свайго Федзю і папрасіла маладога лейтэнанта не пісаць. І пісьмы ягоныя спаліла. А ён, бачыш, бярог. Сорак гадоў мінула з таго часу, сорак гадоў...

— Божа, я так пра ўсё забылася, што ні аб чым не нагадалі ні яго імя, ні прозвішча. Ды і ён мяне не пазнаў, не здагадаўся. Тым больш, што прозвішча другое. І пра хутар гэты я тады нават у сне не сніла. Божачка, сорак гадоў...

Яна так задумалася, што не пачула, як у хату ўвайшоў Сяргей Міхайлавіч. Было няёмка, нібы яе засталі за непрыстойным заняткам.

— Гэта мае пісьмы, — працягнула яна пакуначак. — Мае, разумееш?

— А я адразу здагадаўся, што гэта ты. Убачыў у Тамарчыным альбоме фотакартачку, на якой ты маладая, і здагадаўся.

— Чаму ж не прызнаўся? — усміхнулася сарамліва і гарэзліва.

— Чакаў, ці пазнаеш ты мяне.

—А каб не пазнала?

— Некалі сказаў бы... А дакладней, нечым бы сябе выдаў.

— Дзіва, дый годзе, — памаўчаўшы, прамовіла Зінаіда. — Скажы каму, дык не павераць.

— А ты скажы, і тады ўбачыш, — параіў Сяргей Міхайлавіч, і твар яго асвяціла добрая, яшчэ зусім маладая ўсмешка.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

СЛОНИМЧАНИН ЮРИЙ КРЕТОВ ОТКРЫЛ В САНКТ-ПЕТЕРБУРГЕ СВОЙ ТЕАТР

О том, что в Санкт-Петербурге есть театр "Диклон", создателем и руководителем которого является наш земляк Юрий Кретов, я знала давно. Нашу семью с Юрием связывает давняя дружба, начавшаяся еще в 70-е годы в Слонимском народном театре. Юрий Кретов — уроженец Слонима, окончил пятую школу. До армии работал на картонно-бумажном заводе в Альбертине. После службы поступил на режиссерский факультет Ленинградского института культуры, а в 1987 году в городе на Неве открыл свой театр "Диклон".

В этом году Юрий Кретов пригласил меня с внучкой в Санкт-Петербург. Это были незабываемые десять дней. Я побывала на многих спектаклях театра, а также на вечере современной хореографии театра "Диклон", который недавно получил национальную российскую премию "Золотая маска-99".


Юрий Кретов

Спектакли "Диклона" демонстрировались в доме ученых, доме актера, доме писателей, на малой сцене Большого драматического театра имени Товстоногова, в доме-музее Ахматовой и в других местах. Театр уже выступал в Гамбурге, есть приглашения из Японии и Швеции. А Мальтийский орден предлагает "Диклону" статус Королевского театра плюс 15 минут Евровидения ежедневно. О театре в Санкт-Петербурге говорят, спорят, называют феноменом, элитным. Спектакли "Диклона" дают лишь приблизительное представление о сути прикосновения к чуду. Рассказать об этом могут лишь те, кому посчастливилось погрузиться в его атмосферу, пережить...

Очень красив в спектаклях и в жизни сподвижник Юрия Кретова Виталий Казимирчик. Он тоже наш земляк из Жирович. "Один из катализирующих начал", — говорит о нем Юрий Васильевич.

Конечно, без Санкт-Петербурга не было бы таких способных ребят, как Юрий Кретов и Виталий Казимирчик. Но слонимская земля — это тоже кусочек их жизни и становления, который засверкал в северной столице России.

Когда я уезжала из Санкт-Петербурга, наши земляки попросили меня низко кланяться Светлане и Николаю Варвашевичам и всем артистам бывшего народного театра, а также Н.И.Кирьянову, А.П.Голодневу, Е.В.Рудневу и коллективу картонно-бумажного завода "Альбертин". Что я с удовольствием делаю.

Римма МИСКО

ПРИЮТИТ ЛИ РОССИЯ ВАСИЛЯ БЫКОВА?

Российская газета "Известия" 26 января этого года поместила материал, посвященный известному белорусскому писателю Василю Быкову и нападкам на него официальных властей Минска. Печатаем его с некоторыми сокращениями.

Помогите писателю!

Ничего удивительного нет в том, как белорусские геростраты встретили Василя Быкова, вернувшегося в Минск после двухгодичного отсутствия. Куда там цветы — не до них, если даже на доброе слово поскупились. Вместо подходящих случаю поздравлений с престижной российской премией "Триумф", еще раз внушительно подтвердившей широкое, можно сказать, мировое признание писательского таланта, — развязное телешоу, вылившее на лауреата ушаты помоев. В обществе, элементарно цивилизованном, так не поступают. Тем паче с человеком, много лет назад заслуженно удостоенным почетного звания народного писателя.


Неудивительно и то, что штатным обвинителем Василя Быкова выступил на белорусском ТВ Владимир Севрук. Бывший заместитель заведующего отделом пропаганды ЦК КПСС. После гэкачепистского путча в августе 1991-го из Москвы исчез, чтобы объявиться вскоре в Беларуси. Сейчас он один из приближенных белорусского президента, ведает, как и в звездный свой час, не то пропагандой, не то культурой, не то тем и другим вместе. Его исступленная страсть к шельмованию Василя Быкова — пожизненное влеченье, род недуга. Памятна его погромная статья в "Правде" (датированная 1966 годом) о повести "Мертвым не больно", не переиздававшейся потом без малого четверть века. Публикация ее в "Новом мире" Твардовского клеймилась как грубая идейная ошибка и самого белорусского писателя, и пригревшего его крамольного журнала. С той давней поры и пошло-поехало: не стало для В. Севрука большей услады, чем одержимо топтать Василя Быкова.

Ясно, что спокойного житья неугодному писателю в нынешней Беларуси, судя по всему, не будет. Потому и не будет, что он ее национальная гордость и совесть.

Так почему бы правительству ли Москвы, президентской ли администрации не пригласить писателя, перешагнувшего 75-летний рубеж, в Россию на постоянное или временное — сам решит — жительство? Это дало бы ему возможность работать без избыточных волнений и нервных встрясок, каких и без того хватало на его неспокойном веку. И уж по крайней мере это позволило бы писать письма друзьям, не ставя на конвертах во избежание постыдных соглядатайств и наушничаний, эвфемистически именуемых перлюстрацией, вымышленный обратный адрес.

Пригласите же в Москву писателя, опального и гонимого у себя на Родине! Обращаюсь с этим к столичному мэру. Обращаюсь к председателю российского правительства, исполняющему обязанности президента.

Валентин ОСКОЦКИЙ,
секретарь Союза писателей Москвы



Ситуация в Беларуси катастрофическая во всех смыслах

Ситуацию прокомментировал Василь Быков:

— Сегодня в Беларуси сложились хорошие условия для возвращения той идеологии, которая владела умами в советские времена. И естественно, для возвращения в коммунистическое прошлое нужны кадры. Они и востребованы. Севрук, кстати, не один. Место работы в Беларуси нашли многие бывшие высокопоставленные чиновники советского режима, включая военных и сотрудников спецслужб.

Впрочем, я уже давно не реагирую на подобные выпады в мой адрес. И никогда на них не реагировал, за исключением одного случая. Это было где-то в середине 80-х годов, когда тот же Севрук работал в ЦК КПСС. Он тогда нападал не только на меня, но и на Алеся Адамовича, который в то время много выступал в печати, и его имя становилось известным на Западе. Адамович уговорил меня написать жалобу на имя Горбачева, тогда только пришедшего к власти. То есть пожаловаться на Севрука, который не давал нам жизни — ни в Минске, ни в Москве. И мы написали эту бумагу и послали Горбачеву.

Я оцениваю нынешнюю ситуацию в Беларуси как катастрофическую во всех смыслах — в политике, и в экономике, и в обществе. Это катастрофа, от которой не спасут никакие действия по объединению с Россией, ни с какой-либо другой страной. Потому что слишком глубоко и далеко зашел политический и экономический кризис.

Что же касается беспокойства моих московских друзей, то спасибо им большое за это.

Известия

ПАЭЗІЯ

Вершы Алега Януля

Ён захапляецца маляваннем, займаецца ўсходнімі адзінаборствамі, цудоўна іграе на некалькіх музычных інструментах, прыроджаны акцёр і рэжысёр, і яшчэ — таленавіты паэт.



Нарадзіўся Алег Януль у сям'і настаўніка ў 1957 годзе ў вёсцы Дзярэчын, што на Зэльвеншчыне.

Пасля заканчэння Дзярэчынскай школы ў 1974 годзе некаторы час працаваў у родным калгасе "Светлы шлях".

У 1980 годзе скончыў рэжысёрскае аддзяленне Мінскага інстытута культуры і доўгі час працаваў у розных установах культуры горада Гродна. Пісаў сцэнарыі для агітбрыгад.

Першыя вершы надрукаваў у зэльвенскай раённай газеце "Праца", а пазней яны друкаваліся ў "Гродзенскай праўдзе", "Пагоні", "Міліцэйскім весніку".

Алег Януль рыхтуе да друку свой першы паэтычны зборнік. Ён жыве ў Гродне, але не парывае сувязі з зэльвенскім літаб'яднаннем і займаецца прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Пётр МАРЦІНОЎСКІ

Прачнуліся званы Гародні

Край абудзіўшы наш заходні,
Праслаўлены ва ўсе вякі,
Прачнуліся званы Гародні,
Ударылі вечавікі...

Над Прынямоннем стогнуць бомы,
Ірвуць нам душы на шматкі,
Праз плач пытаюць: скуль мы, хто мы,
За што нам выпаў лёс такі?..

На волю рвецца боль народны,
Вякоў не спраўджаны прысуд.
Гудуць, завуць званы Гародні,
Нашчадкі гарадзенскіх труб...

І з уваскрэшаным тым звонам,
Страсаючы пласты ілжы,
Галосіць з гарадзенскім бомам
Народ, распяты на крыжы...

Званы гудуць, а я нямею,
Малюся гмахам камяніц
І плачу, бо не разумею
Тваіх, Айчына, таямніц...

Завуць званы... Я чую крокі...
Сышло цярпенне грамады,
Бо прывялі ілжэпрарокі
Народ да прорвы, да бяды.

І больш няма куды падацца.
Рука да болю цісне крыж.
І так карціць перажагнацца,
Што, мусіць, болей не сцярпіш...

Прачнуліся званы Гародні...

Скрыжалі

Давыду Гарадзенскаму

Мінуўшчына...Твае маршчыны
Пасеклі твар зямлі маёй.
Працяты Нёмана глыбіні
Наскрозь паганскаю стралой...
Мінуўшчына, твае скрыжалі
Не засцярог славянскі герб.
Магутнай плынню змыў без жалю
Няўмольны Нёман, часу серп...
О, Нёман! Ты заўжды са мною,
Вякоў сумленне і прысуд.
З тваёю я жывой вадою
П'ю рэха гарадзенскіх труб,
П'ю гоман пушчаў пershaбытных,
Пласт бітваў, фактаў і падзей,
